УДК 329. 1/6 (476) + 947. 6 «1917»

П.В. Дзядзюля, дацэнт

# ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ І РУХАЎ У ПЕРЫЯД З ЛЮТАГА 1917 Г. ПА СНЕЖАНЬ 1917 Г.

The article examines the activity of social and cultural organisations and movements in one of difficult periods of the history of our country from February 1917 till December 1917.

Ацэнка Расіі Леніным як турмы народаў пацвярджалася ў магутных нацыянальна-вызваленчых рухах народаў імперыі пасля Лютаўскай рэвалюцыі.

Разбойная вайна, эканамічная разруха, бежанства, шматтысячныя ахвяры на франтах і ў тыле паскорылі палітычнае, нацыянальнае сталенне беларусаў. Найбольш свядомыя, дальнабачныя з іх разумелі неабходнасць кансалідацыі, збірання інтэлектуальных сіл для выпрацоўкі планаў аўтаноміі Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расіі, фарміравання праграм нацыянальнай школы, культурнага будаўніцтва.

Папярэдняя культурна-асветніцкая, палітычная дзейнасць «Нашай нівы», беларускіх выдавецтваў, грамадскіх арганізацый сведчыла, што патэнцыял занядбанага, расцярушанага вайной і галечай народа вялікі. Ужо ў пачатку сакавіка 1917 г. прадстаўнікі беларускіх арганізацый прынялі ўдзел у шматлікіх маніфестацыях у гонар перамогі рэвалюцыі, якія праходзілі ў Мінску, Віцебску, Гомелі і іншых гарадах і мястэчках.

У агульнай калоне ў Мінску 6 сакавіка члены Часовага Беларускага нацыянальнага камітэта, які працягваў дзейнасць Мінскага аддзела Беларускага таварыства пацярпелых ад вайны, прайшлі пад сваім сцягам з лозунгамі: «Вітаем волю народа!» і «Жыве Беларусь!». 10 сакавіка на Залатой Горцы гэты камітэт правёў самастойны мітынг, дзе з прамовамі на беларускай мове выступілі П. Аляксюк, А. Смоліч, У. Фальскі, Ф. Шантыр. Праз два дні ў кінатэатры «Гігант» адбыўся новы беларускі мітынг, дзе выступілі Р. Скірмут, прафесар П. Масоніус, Ф. Шантыр і іншыя прамоўцы. Адначасова на вуліцах Мінска прадаваліся значкі нацыянальных колераў Беларусі – чырвонага з белым. Выручаныя сродкі меркавалася накіраваць на стварэнне беларускага друку [1].

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі аднавіла сваю дзейнасць Беларуская сацыялістычная грамада, якая ў пэўнай ступені з'яўлялася палітычным і арганізацыйным цэнтрам нацыянальнага руху. Важнейшымі задачамі праграмнай дзейнасці Грамады былі нацыянальна-тэрытарыяльная аўтаномія Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай федэрацыі і развіццё беларускай культуры, мовы.

Беларуская ідэя паступова станавілася прыцягальнай для многіх жыхароў Беларусі і тых, хто па розных прычынах яе пакінуў. Гэта былі бежанцы сусветнай вайны, вайскоўцы і тыя, хто знайшоў працу ў прамысловых цэнтрах Расійскай імперыі. Абставіны вайны, тылу, умовы выжывання, прыклады прадстаўнікоў іншых народаў абвастралі нацыянальныя, зямляцкія пачуцці беларусаў. Яны ўсё больш усведамлялі неабходнасць быць у еднасці з блізкімі людзьмі ў часы, калі іх дому, краю пагражае небяспека.

Толькі за адзін паслярэвалюцыйны месяц узніклі буйныя арганізацыі ў Петраградзе, Маскве, Саратаве, Віцебску, Бабруйску, гарадах Сібіры, Украіны, на франтах, марскіх базах. Амаль усе яны мелі праграмы, дзе побач з палітычнымі, сацыяльнымі патрабаваннямі быў выказаны клопат аб навучанні дзяцей і дарослых беларускай мове, аб вяртанні на радзіму вывезеных у час вайны культурных каштоўнасцей [2].

25–27 сакавіка 1917 г. у Мінску працаваў з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый, на якім прысутнічала 150 удзельнікаў. Сярод дэлегатаў з'езда былі вядомыя беларускія дзеячы А. Смоліч, Б. Тарашкевіч, У. Фальскі, Э. Будзька, П. Мядзёлка, З. Жылуновіч і іншыя.

Значнасць з'езда падкрэслівалася не толькі аўтарытэтнасцю яго ўдзельнікаў, але і шматлікімі прывітальнымі тэлеграмамі ад беларускіх арганізацый з Петраграда, Харкава,

Яраслаўля, Магілёва, Бабруйска, Оршы, Слуцка.

На з'ездзе прагучала трывога за стан беларускай мовы, якую некалі «шанавалі пры княжацкіх дварах», якая «была ўрадавай». «Каб народ быў моцны, то ён павінен мець усё сваё: школу, мову, культуру», – сказаў у сваім выступленні ксёндз Гадлеўскі. Удзельнікі з'езда з вялікім клопатам абмяркоўвалі пытанні нацыянальнай школьнай адукацыі, становішча настаўнікаў, асветы сялянства, выдання літаратуры, асабліва падручнікаў, бібліяграфічнага даведніка ўсіх беларускіх кніжак, прац аб Беларусі на замежных мовах [3].

Выпрацаваная на з'ездзе праграма арганізацыі нацыянальнай асветы не атрымала шырокай падтрымкі тагачаснага грамадства Беларусі. Шматгадовая русіфікацыя, непрызнанне Часовым урадам права на самавызначэнне і культурнае развіццё, тармажэнне чыноўнікамі на месцах працэсу дэмакратызацыі адукацыі і пераводу выкладання на родную мову вучняў не спрыяла ўсведамленню беларускім народам важнасці нацыянальнай школы, культуры.

Але на шматлікіх у той час грамадска-палітычных акцыях усё часцей выстаўляюцца патрабаванні ўвядзення беларускай мовы ў школы, стварэння ВНУ, адкрыцця культурна-асветных устаноў.

У красавіку 1917 г. у Мінску І з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў выказаўся за наданне кожнай нацыянальнасці краю права культурна-нацыянальнага развіцця, за ўвядзенне ўсеагульнага бясплатнага навучання, выкладання ў пачатковых школах на роднай мове. За нацыянальную школу выступіў з'езд Віцебскай губерні, які адбыўся ў красавіку 1917 г. Салдаты і афіцэры Заходняга фронту – ураджэнцы Беларусі – на мітынгу ў Мінску 15 мая 1917 г. прынялі рэзалюцыю аб увядзенні ў школах беларускай мовы, самавызначэнні беларускага народа.

Многія палітычныя партыі, грамадскія рухі патрабуюць развіцця нацыянальнай асветы, культурнага самавызначэння, вядуць растлумачальную працу сярод сялян, рабочых. Беларуская сацыялістычная грамада ў гэты час актыўна выступае за культурна-нацыянальную аўтаномію беларусаў, развіццё беларускай культуры, нацыяналізацыю школы. Нават бальшавікі Беларусі, якія раней ігнаравалі нацыянальны фактар у сваёй дзейнасці, улавілі змены ў настроі мас на карысць навучання на роднай мове і ўключылі гэта патрабаванне ў якасці адной з першачарговых задач дэмакратычных пераўтварэнняў.

Неўзабаве з'явіліся і першыя, яшчэ мала заметныя зрухі ў стварэнні беларускай нацыянальнай адукацыі. Камісар Часовага ўрада ў Слуцкім павеце Р. Астроўскі стварае Слуцкую беларускую гімназію, а ў вёсцы Жорнаўка па ініцыятыве М. Радзівіл узнікае адна з першых беларускіх пачатковых школ, у якой настаўніцай працавала П. Мядзёлка. Мінская гарадская дума ў снежні 1917 г. арганізуе 4 першыя беларускамоўныя школьныя камплекты [4].

Сотні тысяч беларусаў знаходзіліся ў арміі. Гэта былі найбольш адукаваныя і дзеяздольныя маладыя людзі, сярод якіх было нямала афіцэраў. Іх вайсковы і жыццёвы вопыт, набыты ў складаных умовах выжывання, падказваў ім, што радзіма ў небяспецы і яе трэба ратаваць. Ідзе пошук арганізацыйных формаў дзейнасці вайскоўцаў. У маі 1917 г. у Мінску была створана Вайсковая беларуская арганізацыя. У сваёй дзейнасці яна кіруецца і «Статутам беларускіх нацыянальных культурна-асветных гурткоў у войску», які быў распрацаваны Цэнтральнай радай беларускіх арганізацый і партый.

З'езды беларусаў-вайскоўцаў праходзяць на ўсіх франтах і Балтыйскім флоце. Акрамя ваенна-палітычных і маёмасных дэлегаты з'ездаў і выбраныя імі органы абмяркоўваюць праблемы абавязковага бясплатнага навучання, развіцця беларускай культуры, вывучэння гісторыі, роднай мовы як фактараў, што «адпавядаюць жыццёвым інтарэсам беларускага народа». Ставіцца пытанне аб неадкладным адкрыцці ў Беларусі універсітэта, сельскагаспадарчага і політэхнічнага інстытутаў. Выказваецца меркаванне аб неабходнасці вяртання эвакуіраваных у Расію помнікаў культуры, мастацтва, а таксама навучальных ус-

таноў, фабрык, заводаў [5].

Унікальная з'ява таго часу – воіны-беларусы, якія прайшлі ўсе ступені русіфікацыі, змардаваныя вайной, абкураныя дымам прапаганды розных палітычных партый бачылі паратунак для сваёй Радзімы найперш у выратаванні культуры, у развіцці нацыянальнай адукацыі.

Імкненне нешматлікай беларускай інтэлігенцыі пазнаць сябе як частку свайго народа, сплаціць яму доўг прымушала яе шукаць новыя формы ўздзеяння на малаадукаваныя, дэзарыентаваныя ў часе і прасторы масы людзей.

Усё большую ролю ў паслялютаўскіх падзеях адыгрывала друкаванае слова. Газеты, лістоўкі, кнігі ўсё эфектыўней уздзейнічалі на свядомасць людзей. На шляху да беларускага друкаванага слова, беларускага школьніцтва стаяла неўнармаванасць мовы, якая цяпер рабілася не толькі мовай вершаў, бытавых апавяданняў, а і мовай публіцыстыкі, тэатра, грамадскіх арганізацый.

Яшчэ Ф. Багушэвіч, Цётка, М. Багдановіч гаварылі аб самай пільнай патрэбе ў граматыцы, слоўніку беларускай мовы. Задачу гэтую, пераадольваючы цяжкасці, вырашыў навуковец Петраградскага універсітэта, вучань прафесара Я. Карскага, Б. Тарашкевіч.

Лютаўская рэвалюцыя адкрыла шлях і да беларускага тэатра. Утварыўся беларускі хор пад кіраўніцтвам У. Фальскага. Пазней з яго выдзеліўся драматычны гурток, які ўзначаліў пісьменнік Ядвігін Ш. Аднавілася дзейнасць забароненага ўладамі ў пачатку вайны «Першага таварыства беларускай драмы і камедыі». Кіраўніком яго і рэжысёрам стаў выпускнік Варшаўскай драматычнай школы Ф. Ждановіч. Ужо 23 красавіка 1917 г. у будынку Мінскага гарадскога тэатра адбыўся першы спектакль па п'есе Янкі Купалы «Паўлінка». Рэпертуар фарміраваўся з п'ес беларускіх, украінскіх, польскіх аўтараў. З'явілася вялікая колькасць здольных артыстаў, якія ў складаных умовах імкнуліся данесці да гледача высокае мастацтва на беларускай мове [6].

У гэты час выходзяць аўтарытэтныя беларускія газеты «Гоман», «Вольная Беларусь», «Грамада», «Беларускі шлях» і іншыя. Яны не толькі даносілі да чытачоў інфармацыю на роднай мове пра найважнейшыя штодзённыя факты, але і прапагандавалі гісторыю і культуру, нацыянальна-дзяржаўную ідэю, вялі палеміку з апанентамі, выкрывалі ворагаў Беларусі [7].

Публіцыстыка ў гэты час з'яўляецца зброяй у барацьбе за Беларусь. Часта прыбягае да гэтага жанру Максім Багдановіч. Хворы на сухоты, ён прыехаў у Беларусь з Расіі, каб падыхаць паветрам Радзімы, адчуць смак крынічнай вады ї перажыць разам з беларусамі гора роднага яму краю. Ён нагадвае беларусам пра іх слаўнае мінулае вершам «Пагоня» і маркоціцца, што старажытны народ страчвае волю да развагі, да супраціўлення. «Агляніцеся, – піша ён у артыкуле «Хто мы такія?», – усё нашае, роднае, беларускае марнуецца, нішчыцца, знікае, бо яго забіваюць, яго прыглушаюць, ім пагарджаюць, а чужое пануе ... мае сабе пашану і павагу. І хто ведае? – быць можа, пройдзе колькі часу, і не пазнаем мы ані нашага краю, ані нашых дзяцей. І будзе скрозь усё чужое, незвычайнае, а свайго роднага – нічога» [8].

6–7 чэрвеня 1917 г. у Мінску на з'ездзе беларускага каталіцкага духавенства былі прыняты рэзалюцыі пра навучанне ў школе на роднай мове, выказаны патрабаванні, каб набажэнствы і казанні гучалі на беларускай мове, аб выданні беларускіх падручнікаў і хутчэйшым адкрыцці нацыянальных школ [9].

Галоўнымі памкненнямі значнай часткі беларусаў у гэты трывожны час было заваяванне аўтаноміі, будаўніцтва нацыянальнай школы, узвышэнне беларускай мовы, культуры. З пэўнай доляй наіўнасці яны верылі, што іх зразумее большасць беларусаў і падтрымае і што варожыя сілы, якія фактычна гаспадарылі на спакутаванай зямлі, убачаць святасць намераў і не будуць перашкаджаць. Тым больш што беларусы, пераадольваючы супярэчнасці, змаглі дамовіцца і выбраць самых дастойных на Усебеларускі з'езд. У снежні 1917 г. у Мінску сабраліся 1872 дэлегаты, каб пачаць будаваць сваю дзяржаву.

Збор дэлегатаў, адкрыццё з'езда, першыя выступленні – усё гэта праходзіла эмацыянальна, з радаснай надзеяй, з верай. Капітан Яўген Ярушэвіч, дэлегат з'езда, дзень за днём старанна фіксуе гістарычную для Беларусі падзею. Вайсковы аркестр некалькі разоў выконвае марсельезу, а разам з хорам гімназістак, апранутых у нацыянальныя касцюмы, песні «Ад веку мы спалі», «А хто там ідзе...», «Кроў нашу льюць даўно ўжо каты...» і іншыя [10]. У беларускіх нацыянальных традыцыях аформлены сцэна, зала, вестыбюль гарадскога тэатра. Прэзідыум з'езда займаюць найбольш вядомыя, паважаныя людзі, сярод якіх прафесар Я. Карскі, стары нарадаволец А. Бонч-Асмалоўскі, былы паліткатаржанін А. Гарун, генерал К. Аляксіеўскі, матрос В. Муха і іншыя [11].

Дух свабоды, высокі інтэлектуальны ўзровень, жаданне здзейсніць задуманае – далёка не ўсё, што выявілася ў выступленнях дэлегатаў. Навуковец, салдат, настаўнік, рабочы-чыгуначнік, селянін былі аб'яднаны адзінай ідэяй – Беларусь павінна быць вольнай! Выклікае захапленне і сёння патрабаванне дэлегатаў з'езда ўключыць у парадак работы як першачарговыя пытанні асветы і культуры. Ствараецца асобная «Культурна-асветная секцыя», у якой планавалася абмеркаваць наступныя праблемы: разбурэнне культурна-грамадскага жыцця краю і шляхі яго аднаўлення; запрашэнне культурных сіл для работы на радзіме; неадкладныя пытанні па народнай адукацыі ў Беларусі; вяртанне на радзіму культурных каштоўнасцей, вывезеных за гады вайны [12].

Мо занадта ўзнёсла, але шчыра выказаў імкненне беларусаў да адукацыі, да пазнання высокіх ісцін дэлегат з'езда, дырэктар настаўніцкай семінарыі Шэстаў: «Зямля наша не адбудавана. Мы самі цяпер будзем адбудоўваць сваё жыццё і сваю краіну. Няхай будзе святло адукацыі і пакрыецца край школамі! Няхай усе дзеці, а пасля дарослыя вучацца на роднай беларускай мове. Той, хто супраць беларускай мовы, відаць, сам не ведае яе. Прыдзе час і ў роднай краіне ўзнікнуць розныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, якіх яшчэ не было ў Беларусі. І будзе адкрыта ў нас свая Акадэмія Навук, у якой збяруцца вучоныя сілы, цяпер раскіданыя па ўсёй Расіі. І мы павінны запатрабаваць вяртання на Радзіму ўсіх эвакуіраваных навучальных устаноў» [13]. Пры чарговым выступленні прафесара Я. Карскага з месцаў пад авацыі залы гучалі галасы «Няхай жыве прафесар Беларускага універсітэта Яўхім Карскі!» Падрыхтоўка да адкрыцця нацыянальнага універсітэта лічылася ў той час прыярытэтнай справай. Крыху пазней уносіцца прапанова запрасіць на з'езд тых вучоных, якія маюць друкаваныя працы па пытаннях Беларусі [14]. Прадстаўнік 41 пяхотнай дывізіі Расійскай арміі Шабан звярнуўся да дэлегатаў з прапановай заявіць усяму свету, што ёсць беларусы, і заклікаў размаўляць на з'ездзе на беларускай мове [15].

Пераадолеўшы многія складаныя сітуацыі ў рабоце з'езда, дэлегаты нарэшце выпрацавалі асноўны дакумент – Рэзалюцыю, у якой сцвярджалася права беларускага народа на самавызначэнне. З'езд пастанаўляў: «... неадкладна ўтварыць са свайго склада орган краявой улады ў асобе Усебеларускай Рады Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў, якая часова становіцца на чале ўпраўлення краем, уступаючы ў рабочыя адносіны з Цэнтральнай уладай» [16].

У самы адказны момант работы з'езда, калі дэлегаты рыхтаваліся прагаласаваць за радасныя вынікі сваёй дзейнасці, гэта значыць за ўладу народа ў Беларусі і, фактычна, за яе аўтаномію ў дэмакратычнай Расіі, у залу ўварваліся ўзброеныя бальшавікі і груба, нахабна разагналі народны форум, арыштавалі прэзідыум і частку дэлегатаў. Вышэйшае духоўнае азарэнне беларусаў было жорстка перапынена. Найбольш актыўныя дзеячы нацыянальнага руху былі пасаджаны ў турму. Зноў заставаліся толькі надзеі на змену абставін і вера ў пакуль што драмаўшыя інтэлектуальныя сілы значнай часткі беларусаў.

Ідэі Усебеларускага з'езда часткова былі рэалізаваны ў дзейнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, але тагачасныя ўлады, не зважаючы на дэкларацыі самавызначэння народаў, не дазволілі беларусам стварыць сваю дзяржаву і, адпаведна, адрадзіць нацыянальную культуру. І зноў беларуская мова, літаратура, культура недзе на задворках еўрапейскай цывілізацыі.

## ЛІТАРАТУРА

1. ЭГБ. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1999. – Т. 5. – С. 182; Рудовіч С.С. Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г. – Мн.: Тэхналогія, 2001. – С. 79.
2. Захарка В. Галоўныя моманты беларускага руху // Спадчына. – 1997. – № 5. – С. 4.
3. Пратакол з'езда Беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 сакавіка 1917 г. // Спадчына. – 1990. – № 4. – С. 29–33.
4. Ляхоўскі У. Пачатак тварэння беларускае нацыянальнае школы // Спадчына. – 2001. – № 1–2. – С. 76; Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1974. – С. 104.
5. Ліс А. Цяжкая дарога свабоды. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1994. – С. 186–187; Савіцкі В. Беларускае войска: ад ідэі да спроб рэалізацыі (1917) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 4. – С. 56–57.
6. Дыла Я. Творы. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1981. – С. 316–319.
7. ЭГБ. – Мн.: Беларуская Энцыклапедыя. – 1995. – Т. 5. – С. 449.
8. Багдановіч Максім. Хто мы такія ? // Поўны збор твораў: У 3 т. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – Т. 3. – С. 127.
9. З'езд каталіцкага духавенства // Памяць – Мінск: У 4 кн. – Мн.: БелТА, 2002. – Кн. 2. – С. 295; Калубовіч Я. Акт 25 сакавіка і адраджэнне нацыянальнай беларускай культуры // Спадчына. – 1992. – № 1. – С. 68.
10. Усебеларускі з'езд 1917 года. Сведчанне сучасніка // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 2. – С. 47.
11. Ліс А. Цяжкая дарога свабоды. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1994. – С. 190.
12. Усебеларускі з'езд 1917 года. Сведчанне сучасніка // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 67.
13. Там жа, № 2. – С. 48; № 3. – С. 62.
14. Там жа, № 3. – С. 66.
15. Там жа, № 4. – С. 56.
16. Там жа, № 4. – С. 57.